# Зень добры, новы год вучэбны!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

**Беларускі УНІВЕРСІТЭТ**

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 23 (454) Серада, 5 верасня 1961 г. Цана 1 кап.



Радасна вітае сяброў другакурснік АЛЯКСАНДР ДУДКО.

## МІР

Мір — жыццё і каханне,
Шчасце, радасць, усмешкі,
Галубоў вуркатанне,
Дружбы светлыя сцежкі.
Гэта — мора пшаніцы,
Свірны, поўныя збожжа,
Подых чыстых крыніцаў,
У Сусвет падарожжа.
Мір — Камуны ўрачыстасць,
Думкі ўзлёт, нашых мараў...
Людзі! Неба ачысцім
Ад вайны чорных хмараў.

М. КУЛІНКОВІЧ,
студэнт-завочнік 1-га курса.

## ЗА ВУЧОБУ, СЯБРЫ!

Наступіў новы навучальны год. З новымі сіламі сустракаюць яго выкладчыкі і студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Частка студэнтаў не першы год займаецца ва універсітэце, але нямала і такіх, якія ўпершыню пераступілі парог гэтай старэйшай у рэспубліцы і слаўнай сваімі традыцыямі вышэйшай навучальнай установы. Толькі на стацыянарныя аддзяленні хімічнага, геаграфічнага, фізічнага, біялагічнага, філалагічнага, матэматычнага, гістарычнага, юрыдычнага факультэтаў прынята 775 студэнтаў. Гэтае папаўненне ў 1961/1962 навучальным годзе прыйшло ва універсітэт з калгасных палёў, фабрык, заводаў. Большасць уноў прынятых студэнтаў — людзі са стажам, папрацаваўшыя не адзін год.

Кожны новы навучальны год нясе з сабою нешта новае. 1961/1962 вучэбны год пачынаецца ў абстаноўцы, калі савецкі народ дабіваецца ўсё больших поспехаў у прамысловасці і сельскай гаспадарцы, на розных участках працоўнай дзейнасці. Нашы поспехі — яркае сведчанне таго, што шлях нашага народа, які упэўнена ідзе да камунізма, правільны.

Наша краіна ўпершыню ў гісторыі чалавецтва запусціла першы спадарожнік Зямлі, а фенаменальныя палёты першых ў свеце касманаўтаў Юрыя Гагарына і Германа Цітова даказалі ўсяму свету, што і цяпер Савецкі Саюз упэўнена ідзе наперадзе ў развіцці навукі і тэхнікі, у асваенні і вывучэнні таямніц космасу. Нязменнымі спадарожнікамі савецкага народа з'яўляюцца мір і шчасце.

Нядаўна апублікаваны праект Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза пацвердзіў, што наш народ жадае жыць у міры і дружбе з усімі народамі свету, што савецкія людзі не хочуць вайны, а ўсе свае сілы аддаюць мірнай, стваральнай працы.

Нашай краіне з яе растучай прамысловасцю, навукай, культурай патрэбны новыя і новыя кадры кваліфікаваных, выдатна ведаючых сваю справу спецыялістаў. З пачаткам новага навучальнага года універсітэт пачынае каваць новы атрад інжынераў, хімікаў, фізікаў, матэматыкаў, настаўнікаў, журналістаў і г. д. Сотні выпускнікоў БДУ імя Леніна ўжо працуюць на заводах і ў школах, у навуковых лабараторыях і іншых спецыяльных установах рэспублікі.

Увагу, клопаты Камуністычнай партыі да выхавання падрастаючага пакалення мы бачым усюды. Многа радасных змен адбываецца вакол нас у жыцці. Не абыйшлі яны і наш універсітэт. Нясупынна абнаўляюцца лабараторыі ўніверсітэта, пашыраюцца яго кафедры, а да дня 22 з'езда КПСС калектывы рабочых УНР-67 і УНР-68 заканчваюць аддзелачныя і абліцовачныя работы ў новым корпусе універсітэта.

Усім студэнтам і выкладчыкам універсітэта трэба з першага дня вучэбнага года ўключыцца ў напружаную творчую працу і вучобу.

Новых вам поспехаў, сябры!

*У БДУ прыйшлі навічкі*

# Слова — першакурснікам

## Мара збылася

*Цяпер, калі я ўжо студэнтка, мне часта ўспамінаецца той летні дзень 1957 года, калі я толькі што атрымала атэстат сталасці. Перад намі, учарашнімі дзесяцікласнікамі адкрылася шырокая дарога ў жыццё. «Кім быць? З чаго пачаць?»,—такія пытанні задае сабе амаль кожны, хто атрымлівае атэстат сталасці. Спачатку я многа думала аб паступленні ў Ленінградскі дзяржаўны універсітэт. Але я ведала, ды і не толькі ведала, а і бачыла, што ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, ў першую чаргу бяруць людзей, якія працавалі на вытворчасці не менш двух год. З вялікай зайдрасцю глядзела я на людзей, якія мелі працоўны стаж і станавіліся студэнтамі.*

*Рашэнне ісці на вытворчасць прыйшло не адразу. 24 верасня 1957 года стаў маім першым рабочым днём. Было гэта ў г. Бабруйску, у арцелі «Швейпром», дзе я ў якасці вучаніцы пачала свой працоўны шлях.*

*Прыйшла вясна 1958 года. Аднойчы на камсамольскім сходзе нам зачыталі рэзалюцыю 13 з'езда камсамола, якая заклікала моладзь краіны паехаць на работу ў раёны цалінных і абложных зямель. Сярод заяў дзяўчат, ехаўшых жыць і працаваць у Цалінны край, была і мая заява. Вось там, на цаліне і пачалося цяжкае, але сапраўднае жыццё. Не лёгка было адказацца ад горада, супроць волі бацькоў паехаць у далёкі цалінны саўгас, ды толькі там мы зразумелі, што правільным было рашэнне нашай партыі і ўрада аб тым, каб моладзь першым ісці ў інстытуты, папрацавала на вытворчасці.*

*На цаліне адбылася праверка нашай сілы волі, упартасці, працавітасці. Мне, напрыклад, прыйшлося быць спачатку разгрузчыцай зерня на таку, потым вагаўшчыцай, выхавацелем у дзіцячым садзе, культработнікам. Работа вельмі захапляючая, а галоўнае, цікавая, жывая.*

*Калі прыйшоў снежань 1960 года і асаблівай работы ў саўгасе не было, я разлічылася з работай і прыехала ў Мінск, каб прайсці падрыхтоўчыя курсы пры Беларускім дзяржаўным універсітэце імя Леніна.*

*У гэтым годзе я трымала ўступныя экзамены на філалагічны факультэт і стала студэнткай. Мара мая збылася!*

*Рая ПРУДЗІЧ.*

## Ад станка

Ці даўно гэта было—апошні экзамен, выпускны вечар, атэстат сталасці. Куды пайсці? Я вырашыла гэта пытанне адразу.

У той час на магілёўскім заводзе «Электрарухавік» ствараўся маладзёжны цэх. Сюды ішлі ўчарашнія дзесяцікласнікі, навучэнцы тэхнічных вучылішчаў, юнакі і дзяўчаты са спецыяльнасцямі і без іх. Стала вучыцца на свідравальшчыцу і я. Праз пяць месяцаў, атрымаўшы другі разрад, пачала самастойна працаваць.

Але думка пра далейшую вучобу не пакідала мяне. Яшчэ ў школе я захаплялася фізікай, любіла праводзіць розныя вопыты. Калі я працавала ў механа-штамповачным цаху, вельмі часта прыходзілася сустракацца з такімі пытаннямі, на якія не заўсёды магла даць адказ.

Цяпер я стала студэнткай БДУ. І тут атрымаю тое, да чаго імкнулася ў школе і на заводзе, — буду вывучаць любімы прадмет.

*Тамара ГОЛУБ.*

## Я выбраў фізіку

*Яшчэ ўчора, здаецца, я стаяў у караўле. А сёння перада мной, як і тысячамі маіх аднагодак, адчыніліся дзверы аўдыторый. Пачалося новае жыццё, з'явіліся новыя клопаты. І я рад гэтым пераменам, таму што дарога ва ўніверсітэт для мяне пачалася даўно.*

*Пасля заканчэння сямігодкі я паступіў у Полацкае педвучылішча. З 1957 года працаваў настаўнікам малодшых класаў, потым прызвалі ў армію...*

*Мяне заўсёды вабіла фізіка— складаная і вельмі цікавая навука, і я бясконца шчаслівы, што стаў студэнтам фізічнага факультэта. Ведаю: уперадзе будзе нямала цяжкасцей. Але мне падабаецца фізіка, і пагэтаму я буду старацца пераадольваць перашкоды.*

*Сяргей Слесарэвіч.*



Гэта будзе мой новы дом.

Фотаэцюд Р. ЗАЛЕСКАГА.

## Наша новае папаўненне

Ад станка, з калгаснай вёскі, са школьнай скамейкі прыйшло ва універсітэт у гэтым годзе новае папаўненне. Наша дружная студэнцкая сям'я папоўнілася вялікай колькасцю першакурснікаў.

У гэтым годзе ва ўніверсітэт значна быў павялічаны прыём на стацыянарнае, завочнае, вячэрняе навучанне. Так, напрыклад, на стацыянар прынята 775 чалавек, з іх 446 маюць працоўны стаж. Прыкладна столькі ж прынята на завочныя факультэты, удвая менш—на вячэрні. Асабліва павялічаны прыём на фізічны і матэматычны факультэты.

Хто ж яны, прыйшоўшыя ва універсітэт? Пераважаючая большасць — людзі са стажам.

Многія вучацца без адрыву ад вытворчасці. На стацыянары будуць вучыцца былыя рабочыя, служачыя, дэмабілізаваныя воіны, асабліва на філалагічным, юрыдычным і гістарычным факультэтах.

На іншых жа факультэтах разам з людзьмі са стажам будуць займацца ўчарашнія дзесяцікласнікі.

## Абмеркаванне праекта Праграмы КПСС

У атмасферы аднадушнага адабрэння праходзіць ва універсітэце абмеркаванне праекта Праграмы КПСС. Камуністы, кандыдаты партыі, камсамольцы, выкладчыкі, аспіранты, абслугоўваючы персанал—увесь калектыў універсітэта усім сэрцам прыняў велічныя перспектывы, якія паставіла партыя перад савецкім народам.

Учора на філфаку і гістфаку адбыліся партыйныя сходы, на якіх камуністы аднагалосна прынялі рэзалюцыі ў падтрымку праекта Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Абмеркаванне праекта Праграмы ідзе і на іншых факультэтах.

